Падтрымай "Вясну" на PATREON

Нібыта ўкусіла, нібыта падрала... Жорсткі прысуд Таццяне Туравец за гвалт над супрацоўнікамі міліцыі

28.05.2021 **Тэгі**: суды, крымінальны пераслед



Таццяна Туравец. Фота: "Віцебская Вясна".

У судзе Віцебскага раёну 28 траўня вынесены прысуд па крымінальнай справе ў дачыненні да жыхаркі пасёлку Ноўка Таццяны Туравец. Выхавальніцу дзіцячага садка абвінавацілі ў здзяйсненні гвалту ў дачыненні да супрацоўнікаў міліцыі. А менавіта, што жанчына падчас «затрымання» ўкусіла за палец аднаго, пракусіла пальчатку другому і нанесла удар нагой у вобласць галавы трэцяму супрацоўніку.

Справу разглядала суддзя **Наталля Траццякова**. Дзяржабвінаваўца – **Мікіта Раманоўскі.**

Паводле абвінаваўцы, уначы з 9 на 10 лютага Таццяна Туравец перашкаджала законнай дзейнасці супрацоўнікаў міліцыі, а менавіта – правесці ператрус у яе доме. Жанчына нібыта чыніла актыўны супраціў, хапала іх рукамі, выпіхвала з дому, пагражала фізічнай расправай, абражала. Дзеянні Туравец у дачыненні да пацярпелых **Сергіенкі, Старчанкі, Філіпенкі, Шутава** пракуратура палічыла наўмыснымі. Міліцыянты вымушаныя былі ўжыць у дачыненні да яе фізічную сілу і надзець на рукі кайданкі.

Справа Туравец: у судзе жарсці вакол падранай пальчаткі міліцыянта, пракурор просіць тры гады калоніі

У сваім апошнім слове Таццяна Туравец адзначыла, што на той момант для яе пацярпелыя не былі супрацоўнікамі МУС, і паводзілі яны сябе непрыстойным чынам: не паведамілі пра сваю мэту і нічога ёй не адказвалі на пытанні.

Пракурор Раманоўскі запрасіў учора для Туравец тры гады пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Сёння суддзя Наталля Траццякова вынесла прысуд: прызнаць Таццяну Туравец вінаватай у галце над супрацоўнікам міліцыі і прызначыць ёй пакаранне тэрмінам **тры гады абмежавання волі з накіраваннем ва ўстанову адкрытага тыпу.**

Таццяна Туравец у судзе сёння не з'явілася.

Таксама яна павінна выплаціць матэрыяльны ўрон за падраную пальчатку пацярпелага Старчанкі у памеры 16 рублёў 15 капеек і судовыя выдаткі.

Маёмасць Туравец – мабільнік, тэлевізар і пральную машыну LG – суд пакінуў пад арыштам да выплаты накладзенага спагнання.

Твитнуть





СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул

"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

WWW.GAZETABY.CO



ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур'ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 11 палітычных зняволеных

Старэйшыну баптысцкай царквы “Новая Зямля” Андрэя Мамойку і яго жонку Веру асудзілі да “хатняй хіміі”

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Шэсць еўрапейскіх парламентарыяў сталі "хроснымі" для беларускіх палітвязняў

Да 20 гадоў калоніі: фігурантам "справы Nexta" запрасілі тэрміны

Затрыманне футбольнага фаната, новы "тэрарыст": хроніка пераследу 21 красавіка (дапоўнена)

Былога ўчастковага асудзілі да 6 гадоў калоніі па справе "Чорнай кнігі Беларусі"

"Не хацелася, каб хтосьці трапляў туды". Экс-палітзняволены Аляксандр Бабко распавёў пра пераслед па "справе цюкоў"

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

